**Шапавалава, А.** Не сатрэцца з памяці Афганістан / А. Шапавалава // Пастаўскі край. — 2003. — 15 лют. — С. 2.

## НЕ САТРЭЦЦА З ПАМЯЦІ АФГАНІСТАН



***Амаль паўтара дзесяцігоддзя мінула з таго часу, як савецкія войскі былі выведзены з тэрыторыі Афганістана. Вайна працягласцю ў 10 год завяршылася 15 лютага 1989 года, калі апошні наш салдат пакінуў афганскую зямлю. Для гісторыі і чалавечай памяці 14 год – тэрмін зусім невялікі. Але большасці з нас тыя падзеі здаюцца ўжо дастаткова далёкімі – вельмі ж шмат усяго адбылося за такі кароткі час: узброеныя канфлікты ў Нагорным Карабаху і Абхазіі, развал Савецкага Саюза, першая і другая вайна ў Чачні... Таму і ўзгадваем пра Афганістан і ваяваўшых там не так часта, як гэта трэба было б рабіць. Але ёсць сярод нас асобы, для якіх такія ўспаміны – святое. Яны не сатруцца з памяці, напэўна, ніколі. Імя гэтым людзям – воіны-інтэрнацыяналісты.***

Пастаўчанін Юрый Вацлававіч Каравацкі – адзін з многіх, праз чый лёс прайшла афганская вайна. 20-гадовым юнаком пасля заканчэння ў 1984-ым Васількоўскага ваеннага авіяцыйна-тэхнічнага вучылішча, што ў Кіеўскай вобласці, ён трапіў па размеркаванні ў Туркестанскую ваенную акругу. Маладому тэхніку па абслугоўванні самалётаў і рухавікоў праходзіць службу выпала ў знішчальна-бамбардзіровачным палку, які размяшчаўся ў горадзе Чырчыку, непадалёк ад Ташкента. І хоць была гэта свая, савецкая, зямля слова «вайна» ўварвалася ў свядомасць літаральна з першых дзён службы. Пра яе пастаянна нагадвалі вылеты аднапалчан на заданні ў суседні Афганістан, іх расказы пра тое, што адбываецца там, за мяжой.

А неўзабаве ўбачыць усё гэта давялося на свае вочы. У лістападзе 1986 года полк, у якім служыў Ю. В. Каравацкі, быў накіраваны ў зону баявых дзеянняў. Шынданд, Баграм, Кандагар – вось няпоўны пералік месцаў, якія прыйшлося змяніць за год знаходжання ў гэтай паўднёвай краіне. Не трэба і казаць, што смерць кожны дзень хадзіла побач з тымі, хто быў там. І хоць старшы лейтэнант Каравацкі як спецыяліст-тэхнік не прымаў непасрэднага ўдзелу ў баявых дзеяннях, колькі разоў ён мог загінуць, калі ўзятая ў кальцо банда душманаў спрабавала прарвацца праз савецкі аэрадром да сваіх, калі вораг вёў абстрэл пазіцый нашых войскаў, калі,

нарэшце, іх, салдат, пры змяненні месца дыслакацыі палка перапраўлялі на транспартным самалёце або верталёце на іншы аэрадром...

Слухаючы расказ Юрыя Вацлававіча пра тыя падзеі, не магла не спытаць, што адчуваў ён у такія хвіліны.

– Пачуццё страху было толькі ў першыя месяцы знаходжання ў Афганістане. – шчыра прызнаўся Ю. В. Каравацкі. – Пазней яно неяк прытупілася. І нават свіст куль недзе побач здаваўся ўжо прывычным. Толькі смерць таварышаў па-ранейшаму пранізвала болем усяго наскрозь.

Юрыю Вацлававічу, без перабольшвання, пашанцавала. Ці то дапамаглі шчырыя малітвы блізкіх людзей і крыжык, які маці зашыла ў кіцель перад адпраўкай сына ў Афганістан, ці то ангел-ахоўнік стаяў увесь час за плячыма, але варожая куля так ні разу і не зачапіла яго.

Пасля Афганістана былі яшчэ два гады службы на старым месцы, у Чырчыку. А калі вайна закончылася, Ю. В. Каравацкі перавёўся на радзіму, у Паставы, дзе яго з нецярпеннем чакала жонка Алёна, з якой ажаніўся незадоўга да адпраўкі ў «гарачую кропку». Служыў у авіяцыйна-штурмавым палку, што размяшчаўся ў 6 гарадку: абслугоўваў самалёты СУ-25, быў начальнікам разліку. Калі ж у 1995 годзе полк расфарміравалі, Юрыю Вацлававічу прыйшлося перабрацца спачатку ў Пружаны, а затым у Баравуху і перакваліфікавацца ў бартавога тэхніка верталётаў МІ-24 і МІ-8. Але доўга быць удалечыні ад сям'і, у якой да гэтага часу ўжо падрастала дачушка Насця, ён не змог і ў снежні 1983-га прыняў рашэнне звольніцца з Узброеных Сіл. Уладкаваўся стралком у раённае аддзяленне аб'яднання «Ахова».

…Вось ужо 4 гады Ю. В. Каравацкі жыве цывільным жыццём, без асаблівага шкадавання развітаўшыся з арміяй. Пра ваенную маладосць нагадваюць хіба што фотаздымкі сяброў-аднапалчан, а таксама медаль «За баявыя заслугі» і імянны наручны гадзіннік, якім быў узнагароджаны ад імя колішняга міністра абароны СССР Язава за ўдзел у баявых дзеяннях.

Але час ад часу 12-гадовая Насця просіць бацьку расказаць пра вайну. Здараецца, што з такой просьбай звяртаюцца і знаёмыя, калі прыходзяць у госці. Толькі ўспамінаць пра Афганістан Ю. В. Каравацкі не вельмі любіць. І не таму, што гэта балюча. Проста, па яго словах, не кожны чалавек можа зразумець таго, хто быў там. Ахвотна дзеліцца перажытым толькі з такімі ж, як сам, воінамі-інтэрнацыяналістамі, штогод сустракаючыся 15 лютага, у Дзень памяці.

Сёння яны таксама збяруцца разам, каб у каторы раз узгадаць свае баявыя дарогі і тых, каму не наканавана было прайсці іх да канца. І абавязкова ўзнімуць трэці тост за ўсіх, каго няма побач.

**А. Шапавалава**

Фота: Д. Курыловіч